Установа адукацыі
«Беларускідзяржаўны ўніверсітэткультуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па навуковай рабоце
БДУКМ
______________В. Р. Языковіч
«____» _____________ 2020 г.
Рэгістрацыйны № ВД- _____вуч.

# НАРОДНА-ІНСТРУМЕНТАЛЬНАЯ МУЗЫЧНАЯКУЛЬТУРАБЕЛАРУСІ

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*дляспецыяльнасцей 1-16 01 06 Духавыя інструменты*
*(па напрамках),1-18 01 01-02Народная творчасць*
*(па напрамках),напрамку спецыяльнасці Народная творчасць*
*(інструментальная музыка), спецыялізацый 1-18 01 01-02 01*
*Інструментальная музыка народная,*
*1-18 01 01-02 02 Інструментальная музыка духавая*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2020

Вучэбная праграмаскладзена ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйных стандартаў Рэспублікі Беларусь ОСВО 1-18 01 01 2013Народная творчасць (па напрамках) і ОСВО 1-16 0106-2013 Духавыя інструменты (па напрамках), вучэбных планаўустановы вышэйшай адукацыі па напрамках спецыяльнасцей. Рэг. № С 16-1-66/17 вуч., С 18-1-68/17 вуч.

**СКЛАДАЛЬНІК**

*Н.П. Яканюк,*прафесар кафедры тэорыі музыкі і музычнай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»,доктар мастацтвазнаўства, прафесар

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Г. С. Мішуроў,* прафесаркафедры духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар мастацтвазнаўства, прафесар;

*Г. А. Паласмак,*дэкан факультэта мастацтваў ПУА «Інстытут сучасных ведаў імя А. М. Шырокава», кандыдат мастацтвазнаўства

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* тэорыі музыкі і музычнай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 22.11.2018 г.);

*навукова-метадычным саветам*установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол №2 ад19.12.2018 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Н.П.Яканюк

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯЗАПІСКА

Беларускаятрадыцыйная народна-інструментальнаямузычная культура – яркая і значнаямастацкаяз’ява. Шматлікасцьпраяў, багацце і разнастайнасцьжанраў і форм, уякіхвыступаегэтая культура,яешматвяковаягісторысведчацьаб той вялікайролі,якуюянана працягу стагоддзяў іграла і іграезараз у духоўнымжыццібеларусаў.Таму вучэбная дысцыпліна «Народна-інструментальная музычная культура Беларусі» іграе значную ролю ў фарміраванні прафесійных якасцей нацыянальных кадраў – будучых кіраўнікоў інструментальных музычных калектываў.

Вучэбная дысцыпліна звязана, перш за ўсё, з вучэбнымі дысцыплінамі спецыяльнасці «Духавыя інструменты (народныя)», «Інструментальная музыка – народная», «Народныя духавыя інструменты»,«Інструментальны ансамбль», «Спецінструмент», «Дадатковы народны інструмент», звучэбнымі дысцыплінамі музычна-тэарэтычнага цыкла «Тэорыя музыкі», а таксама з шэрагам агульнапрафесійных вучэбных дысцыплін, такіх як «Гісторыя мастацтва».

***Мэта вучэбнай дысцыпліны***«Народна-інструментальная музычная культура Беларусі»– набыццё студэнтамі неабходных ведаў і практычных навыкаў абтрадыцыйнай народна-інструментальнай музычнай культуры беларусаў ва ўсёй шматграннасці і своеасаблівасці яе праяў як цэласнай, сацыяльна і мастацка значнай з’явы.

Падчас праходжання вучэбнай дысцыпліны вызначаюцца наступныя агульныя ***задачы***:

– пазнаёміць студэнтаў з гісторыяй, а таксама асноўнымі законамі функцыянавання гэтай культуры ў розным сацыяльным і гістарычным кантэксце;

– сфарміраваць уяўленні аб паходжанні, канструкцыі, мастацкіх магчымасцях і асаблівасцях выкарыстання традыцыйных беларускіх народных музычных інструментаўу аўтэнтычнай практыцы;

– даць уяўленні аб асноўных этапах развіцця, формах, жанравых і стылявых асаблівасцях традыцыйнай народна-інструментальнай музычнай культуры беларусаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– развіць на лепшых узорах нацыянальнага музычнага фальклору аналітычныя здольнасці і мастацкі густ, неабходныя для будучай прафесійнай дзейнасці.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнтам неабходна *ведаць*:

– традыцыйны музычны інструментарый беларускага народа;

– канструкцыю, тэхніка-выканальніцкія і мастацкія магчымасці традыцыйных народных інструментаў;

– гісторыю паходжання, умовы, формы і асаблівасці бытавання беларускіх народных музычных інструментаў у традыцыйнай абрадавай і пазаабрадавай практыцы;

– жанравы склад і характэрныя стылявыя рысы традыцыйнай народна-інструментальнай музыкі розных гістарычных пластоў;

– прынцыповае адрозненне народна-інструментальнай культуры аўтэнтычнай (вуснай) ісцэнічнай (пісьмовай) традыцый;

*умець*:

– сістэматызаваць беларускія народныя інструменты ў адпаведнасці з сучаснай навуковай сістэмай класіфікацыі;

– адрозніваць на слых тэмбры асобных беларускіх народных інструментаў;

– ахарактарызавацьінструментальныя склады традыцыйных ансамбляў і функцыі інструментаў;

*валодаць:*

– метадамі жанравага і стылявогааналізу расшыфровак сольных і ансамблевых найгрышаў;

– уменнем вылучаць нацыянальна-характэрныя стылявыя прыкметы традыцыйнай беларускай народна-інструментальнай музыкі;

– практычнымі навыкамі параўнальнага аналізу аўтэнтычнай і кампазітарскай музыкі для народных інструментаў.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Народна-інструментальная музычная культура Беларусі»павінна забяспечыць фарміраванне наступных кампетэнцый:

ПК-14 – уменне аналізаваць перспектывы і кірункі захавання і развіцця народнай творчасці;

ПК-17 – уменне на навуковай аснове арганізаваць сваю творчую прафесійную дзейнасць, валодаць навейшымі навуковымі распрацоўкамі, а таксама сучаснай інфармацыяй у сферы мастацкай культуры;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-18 – уменне здзяйсняць назіранне за бытаваннем розных відаў і жанраў народнай творчасці з мэтай іх аховы і пераемнасці;

ПК-19 – веданне прынцыпаў і прыёмаў збору, сістэматызацыі, абагульнення і выкарыстоўвання інфармацыі для правядзення навуковых даследаванняў у галіне народнай творчасці;

ПК-23 – выкарыстанне новых інавацыйных тэхналогій навучання (мультымедыйныя тэхналогіі, электронныя падручнікі, фоназапісы);

ПК-24 – уменне працаваць з крыніцамі рэпертуару, літаратурай па народнай творчасці.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Народна-інструментальная музычная культура Беларусі» прадугледжана ўсяго 100 гадзін, з якіх 38 гадзін – аўдыторныя (30 гадзін – лекцыйныя, 8 гадзін – семінарскія). Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТВУЧЭБНАГАМАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Вучэбная дысцыпліна «Народна-інструментальная музычная культура Беларусі» ў працэсе фарміравання музыкантаў-інструменталістаў, спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі. Мэта, задачы і вучэбна-метадычнае забеспячэнне курса.

## Раздзел 1.Тэарэтычныя асновы этнаінструментазнаўства

### *Тэма 1.1. Этнаінструментазнаўства як навука. Структура народна-інструментальнай музычнай культуры вуснай традыцыі*

Этнаінструментазнаўства як навука, прысвечаная вывучэнню традыцыйных музычных інструментаў розных этнасаў. Сувязь этнаінструментазнаўства з этнаграфіяй, сацыялогіяй, фальклярыстыкай. Метады этнаарганалагічных (інструментазнаўчых) і этнаарганафанічных (праз музыку) даследаванняў. Канкрэтныя методыкі навукова-практычнага этнаінструментазнаўства: экпедыцыйная работа, нотная транскрыпцыя народнай музыкі, каталагізацыя і інш. Асноўныя этапы развіцця этнаінструментазнаўстваі яе айчынныя прадстаўнікі.

Песенны і інструментальны фальклор як дзве непарыўныя часткі традыцыйнай музычнай народнай творчасці. Іхпадабенства і адрозненне.

Удакладненнепаняцця «народна-інструментальнаямузычная культура вуснайтрадыцыі». Склад і структура народна-інструментальнаймузычнай культуры вуснайтрадыцыі. Рысы адрознення інструментальнага музычнага фальклору ад народна-інструментальнай культуры пісьмовай акадэмічнай традыцыі.Асаблівасціфункцыянаваннянародна-інструментальнаймузычнай культуры вуснайтрадыцыіў натуральным асяроддзібытавання, яеасноўныяфункцыі. Некаторыяхарактэрныяасаблівасцітрадыцыйнаймузычнайінструментальнай культуры беларусаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 1.2. Музычны інструмент*
*як асноўны аб'ект этнаінструментазнаўства.*
*Класіфікацыя музычных інструментаў*

Народны музычныінструмент –асноўны элемент народна-інструментальнаймузычнай культуры. Народны музычны інструмент як прадмет даследавання этнаінструментазнаўства. Крытэрыі дыферэнцыяцыі народнага інструмента. Паняцце народнага музычнага інструмента.

Музычныя інструменты народаў свету: агульнае і спецыфічнае.Паняцце навуковай класіфікацыі. Характарыстыка вядомых сістэм класіфікацыі музычных інструментаў.

Сістэма класіфікацыі Э.Харнбостэля – К.Закса, яе асноўныя крытэрыі. Агульная характарыстыка груп аэрафонаў, хардафонаў, мембранафонаў, ідыяфонаў.

Класіфікацыя беларускіх народных музычных інструментаў у адпаведнасці з сучаснымі навуковымі ўяўленнямі.

*Тэма 1.3. Жанравы складі асаблівасці функцыянавання*
*беларускай народнай інструментальнай музыкі.*
*Музыканты і музычныя майстры – носьбіты традыцый народнай інструментальнай музычнай культуры*

Формы бытавання беларускай народнай інструментальнай музыкі: сольнае і ансамблевае інструментальнае выканальніцтва, спевы пад музыку. Абрадавапрымеркаваная і непрымеркаваная інструментальная музыка.

Песенныя найгрышы. Выканальніцкія традыцыі адзіночных і групавых спеваў і іх уплыў на стварэнне інструментальнай версіі. Танцавальныя найгрышы. Іх асноўныя, найбольш адметныя стылявыя рысы. Маршы – узоры ўласна інструментальнай музыкі беларусаў. Тыповыя характэрныя рысы сігнальных найгрышаў. Гукавыяўленчыя найгрышы – своеасаблівы пласт беларускай народнай традыцыйнай культуры.

Імправізацыйныхарактарнароднагаінструментальнагамузіцыравання. Варыянтнасць як вядучы прынцып формаўтварэннянайгрышу. Імправізацыйныянайгрышы.

Методыка жанрава-стылявога аналізу фальклорных найгрышаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сацыяльны статус, грамадскае і матэрыяльнае становішча вясковага музыканта. Асоба музыканта ў беларускіх народных казках, паданнях, легендах, абрадах і ў беларускай літаратуры і паэзіі.

Нацыянальна-характэрныя формы засваення музыкантам традыцыйнай інструментальнай музычнай культуры.

Нацыянальная традыцыя вырабу музычных інструментаў. Беларускія майстры па вырабе скрыпак,драўляных духавых інструментаў, гармонікаў.

## Раздзел 2. Беларускія народныя музычныя інструменты класа аэрафонаў

### *Тэма 2.1. Флейтавыя аэрафоны ў традыцыйнай культуры беларусаў. Дудка і акарына*

Аэрафоны ў сусветнай і беларускаймузычнай культуры. Свісток – асноўная канструкцыйная прыкмета флейтавых аэрафонаў. Свісцёлка як традыцыйны музычны інструмент і як прадмет прыкладной народнай творчасці. Яе канструкцыйныя элементы і выразныя магчымасці.

Гісторыя паходжання і тэхналогія вырабу акарыны. Дзве разнавіднасці беларускіх акарын. Мастацкія выразныя магчымасці інструмента.

Дудка (падоўжаная флейта) – найбольш распаўсюджаны ў Беларусі традыцыйны музычны інструмент. Асноўныя разнавіднасці беларускіх дудак. Канструкцыйныя выразныя магчымасці: строй, гукарад, дынамічныя магчымасці, тэмбравыя якасці.Парныя дудкі. Канструкцыя інструмента, яго тэхнічныя і мастацкія выразныя магчымасці.

Спецыфіка бытаванняфлейтавых аэрафонаў у музычнай культуры беларусаў. Асноўныя жанравыя групы і стылявыя рысы найгрышаў, характэрныя для выканання на дудцы.Выкарыстанне пры ігры на дудцы розных прыёмаў ігры. Прыёмы метрарытмічнага ўзбагачэння і мелодыка-інтанацыйнага вар’іравання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма2.2.Язычковыя аэрафоны: іх разнавіднасці і сацыяльна-мастацкія функцыі. Беларускае традыцыйнае бурдоннае шматгалоссе ў мастацтве дудароў*

Асноўныя тыпы пішчыка.Канструкцыйныя і мастацкія асаблівасці жалеек з чароту, жыта, дрэва.

Выкарыстанне ў традыцыйнай музычнай практыцы беларусаў кларнетаў фабрычнага і мясцовага вырабу. Спецыфіка строюнароднага кларнета.

Бытаванне на беларускіх землях дуды (валынкі). Практычныя функцыі меха, соскі, «пірабору», «гукаў». Строй, працоўная тэсітура і тэмбравыя характарыстыкі беларускай дуды. Беларуская дуда ў параўнанні з аналагічнымі інструментамі народаў Еўропы. Адраджэнне беларускай дуды ў сучаснай канцэртна-сцэнічнай практыцы.

Прафесійны характар бытавання культуры дудароў у Беларусі. Тэмбр дуды як своеасаблівы знак, як носьбіт весялосці, святочнасці, танцавальнасці. Дуда як інструмент сольны і ансамблевы.Рэпертуар беларускіх дудароў.

Бурдоннае шматгалоссе як адзін з асноўных тыпаў музычнай фактуры ў музычнай культуры Заходняй Еўропы XIV–XVII стст.ітрадыцыйнай музычнай культуры Беларусі.

### *Тэма 2.3. Амбушурныя аэрафоны: асаблівасці канструкцыі і функцыянавання. Сігнальныя найгрышы.Свабодныя аэрафоны*

Амбушурныя аэрафоны – труба і рог, іх разнавіднасці. Агульнасць уласцівых ім інварыянтных рыс: амбушур як крыніца гуку, натуральны гукарад, адсутнасць іграбых адтулін. Спосабы вырабу інструментаў. Выкарыстанне амбушурных інструментаў як сродку камунікацыі і як магічна-абрадавага інструмента.

Семантыка і інтанацыйны змест пастухоўскіх і паляўнічых рогавых сігналаў. Адпаведнасць інтанацыйнага зместу трубных і рогавых сігналаў канструкцыйным магчымасцям гэтых інструментаў. Тыповыя характэрныя рысы сігнальных найгрышаў.Стылявая роднаснасць пастухоўскіх і паляўнічых сігналаў пры рознасці іх зместу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Свабодныя аэрафоны беларусаў – пуга, ліст травы і дрэва, карынка, дудка са шчылінай на трубачцы берасцянка, пішчэлі, буркаўка, вятрак, жужалка – у прыродным і культурным кантэкстах.

## Раздзел 3. Ідыяфоны і мембранафоны ў традыцыйнай музычнай культуры беларусаў

### *Тэма 3.1.Бубен і барабан*

Бубен у яго дзвюх гістарычных разнавіднасцях. Аб'яднанне ў бубне новай канструкцыі мембранафона з ідыяфонамі. Каляровасць, шматтэмбравасць гучання бубна, абумоўленая канструкцыйнымі і выканальніцкімімагчымасцямі інструмента.

Асноўныя канструкцыйныя віды барабанаў, характэрныя для беларускай традыцыйнай культуры: ваенны і «турэцкі» («вясельны»). Характарыстыка іх канструкцыі і асаблівасцей бытавання.

Грэбень як аматарскі музычны інструмент. Спецыфічнасць утварэння гуку на грэбені. Дваістая трактоўка грэбеня ў традыцыйнай музычнай культуры: як «напяваемага» мембранафона і як ідыяфона.

### *Тэма 3.2.Ідыяфоны. Іх агульныя і адметныя рысы*

Ударна-шумавыя ідыяфоны: трашчотка, кляшчоткі, бразготка, біла, вугольнік. Шархуны, талеркі, званкі як самастойныя музычныя інструменты і як элементы бубна і турэцкага барабана. Прыстасаваныя ў якасці ўдарна-шумавых інструментаў прадметы хатняга побыту.Брусочкі і варган. Выканальніцкае мастацтва Іосіфа Гузікава.

Званы ў музычнай культуры і гісторыі Беларусі. Дзве асноўныя канструкцыйныя разнавіднасці беларускіх званоў: візантыйская і еўрапейская.Параўнанне іх мастацкіх магчымасцей. Грамадскія і мастацкія функцыі звонавых сігналаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 3.3.Гармоніку традыцыйнай культуры беларускага народа. Выканальніцкае мастацтва вясковых гарманістаў*

Гісторыя паходжання гармоніка і яго распаўсюджванне на беларускіх землях. Характарыстыка гармоніка як складанага пнеўматычнагаідыяфона.Канструкцыйныя разнавіднасці інструмента, тыповыя для беларускай культуры: венка, хромка, петраградка,баян, «педалёўка», губны гармонік. Іх патэнцыяльныя мастацкія магчымасці. Мясцовыя традыцыі вырабу гармонікаў. Інструменты беларускіх майстроў.

Уплыў гармоніка на традыцыйную музычную культуру.

Гукаідэал народных вясковых гарманістаў. Іх імкненне да звонкага, святочнага, галасістага, «з разлівам» гучання інструмента. Рэпертуар беларускіх гарманістаў, іх стаўленне да традыцыйнай абрадавай музыкі.

Стылявыя рысы гармошачных найгрышаў, абумоўленыя жанравым зместам музыкі і формай выканальніцтва (сольная, ансамблевая). Залежнасць інструментальнага стылю ў найгрышах танцавальнай групы ад выразнасці харэаграфічнага руху, а ў найгрышах песенных– ад тэкставай страфы і напеву.Найбольш тыповыя агульныя рысы выканальніцкага стылю гарманістаў.

## Раздзел 4. Інструменты групы хардафонаў

*Тэма 4.1.Скрыпка і яе папярэднікі ў Беларусі. Выканальніцкае майстэрства беларускіх скрыпачоў*

Скрыпка і яе папярэднікі ў Беларусі.Асноўныя формы бытаванняскрыпкі ў фальклорнай практыцы. Традыцыйныя шляхі асваення выканальніцкага скрыпічнага майстэрства. Спецыфіка вырабу скрыпкі беларускімі народнымі майстрамі. Канструкцыйныя варыянты інструмента і смыка. Строй, гукарад,патэнцыяльныя выразныя магчымасці народнай скрыпкі. Народная тэрміналогія паводле скрыпкі.

Жанравы дыяпазон рапертуару беларускіх народных скрыпачоў – ад песеннай танцавальнай музыкі і маршаў да імправізацыйных і гукавыяўленчых найгрышаў. Скарыстанне шырокай палітры вынанальніцкіх прыёмаў і штрыхоў. Залеж-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насць выканальніцкіх сродкаў выразнасці ад вобразна-эмацыянальнага зместу найгрышу. Рэгіянальныя скрыпічныя стылі.

Басэтля – смыкавы інструмент, блізкі па канструкцыі віяланчэлі альбо кантрабасу.Рэгіёны распаўсюджвання інструмента ў Беларусі і яго мастацкія функцыі.

*Тэма 4.2.Традыцыя лірніцтва ў Беларусі*

Пранікненне і зацвярджэнне колавай ліры (арганіструма) на беларускія землі. Канструкцыйныя элементы ліры. Строй, дыяпазон, гукарад інструмента. Сацыяльнае функцыянаванне інструмента. Удасканаленне колавай ліры і яе сучаснае выкарыстанне ў мастацкай культуры.

Сацыяльная роля мастацтва беларускіх лірнікаў. Рэпертуар старцаў. Суадносіны інструментальнай і вакальнай партый пры акампанеменце спевам на ліры.

*Тэма 4.3.Цымбалы ў музычнайпрактыцыбеларусаў*

З’яўленне цымбалаў на беларускіх землях і іх выкарыстанне ў маёнткавай і народнай культуры. Арэал распаўсюджвання інструмента. Характэрныя рысы канструкцыі, гукарад і выразныя магчымасці беларускіх народных цымбалаў у параўнанні з сучаснымі ўдасканаленымі.Удасканаленне беларускіх цымбалаў у 20-я гг. XX ст. Іх месца ў сучаснай мастацкай культуры Беларусі.

Рэпертуар народных цымбалістаў, яго абумоўленасць пераважна ансамблевай формай выканальніцтва.Узаемазалежнасць гукаідэалу ад спецыфічных канструкцыйных параметраў інструмента.

Выканальніцкія выразныя сродкі народных цымбалістаў. Асноўныя функцыі цымбалаў у ансамблі вуснай традыцыі.

*Тэма 4.3.Шчыпкова-брынкальныяхардафоныбеларусаў (мандаліна, балалайка, гітара і цытра)*

Дзве канструкцыйныя разнавіднасці мандаліны, характэрныя для народнай выканальніцкай традыцыі. Фактары, якія садзейнічалі шырокаму распаўсюджанню мандаліны ў музычнай культуры беларускай вёскі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дамінуючая роля ў рэпертуары мандаліністаў народных песень і танцаў пераважна позняга гісторыка-стылявога паходжання, папулярных аўтарскіх песень.Асноўныя прыёмы ігры на інструменце, варыятыўнасць іх чаргавання.

Пранікненне балалайкі ў канцы XVIII ст. з Расіі ў Беларусь. Фабрычныя інструменты і балалайкі мясцовага вырабу («даўбёнкі»). Канструкцыйныя разнавіднасці беларускай традыцыі. Выразныя магчымасці інструментаў балалаечнага і гітарнага строю.

Жанравы склад рэпертуару балалаечнікаў з перавагай у ім танцавальных і песенных найгрышаў позняга гісторыка-стылявога пласта. Спецыфіка сольных найгрышаў на інструментах з балалаечным і гітарным строем.Арганічная сувязь у балалаечных найгрышах двух тыпаў музычна-інструментальнага мыслення – гамафонна-гарманічнага і бурдонна-поліфанічнага.

Гітара ўтрадыцыйнай народнай музычнай культуры беларускай вёскі як інструмент вясковай інтэлігенцыі.Строй і выразныя магчымасці гітары.Выкарыстанне гітары ўаматарскай практыцы вясковай інтэлігенцыі для акампанементу пры спяванні рамансаў, песень лірычнага і жартоўнага зместу.

Асаблівасці канструкцыі цытры. Гукарад інструмента ў нізкім, «басовым» і верхнім рэгістрах. Тэмбравая характарыстыка цытры і яе выканальніцкія магчымасці. Месца цытры ў традыцыйнай вясковай культуры беларусаў.

## Раздзел 5.Народная музычная інструментальная культура Беларусі: традыцыі і сучаснасць

### *Тэма 5.1. Традыцыйныя інструментальныя ансамблі беларусаў.Спецыфіка пабудовы народнай ансамблевай партытуры*

Паняцце народнага інструментальнага ансамбля.Традыцыйныя тыпы беларускіх народных інструментальных ансамбляў: па колькасным складзеўдзельнікаў –«дваістыя», «траістыя», капэлі; па складзе ўваходзячых у ансамбль інструментаў – ансамблі, якія ствараюцца з інструментаў адной групы («струнная музыка») і ансамблізмешаныя,з удзелам струнных,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

духавых, мембранафонаў і г. д.Віды інструментальных ансамбляў з удзелам цымбалаў.

Характэрныя для Беларусі малыя «двaістыя» саставы. Траістая музыка: удакладненне паняцця, тыповыя склады ансамбляў.

Вялікія вясельныя ансамблі вясковых музыкантаў –«капэлі». Абумоўленасць іх складаў нацыянальнай і мясцовай традыцыямі,наяўнасцю тых альбо іншых музыкантаў,канкрэтным «заказам»грамады.

### *Тэма 5.2.Жанравыя і стылявыя асаблівасці сольных і ансамблевых найгрышаў*

Паняцце «гукаідэал»у традыцыйнай вясковай культуры. Залежнасць мастацкіх функцый інструментаў у традыцыйным народным інструментальным ансамблі ад тэмбрава-выразных магчымасцей кожнага інструмента, ад узроўню выканальніцкага майстэрства яго ўдзельнікаў, ад свабоды валодання рэпертуарам і яго аб'ёму.

Асноўныя прынцыпы спалучэння інструментаў у ансамблях: прынцып уторы, прынцып камплементарнай рытмікі, функцыянальнага размежавання (гамафонія). Асаблівасці пабудовы народнай ансамблевай партытуры.

Вакальна-інструментальнае выканальніцтва як адна з распаўсюджаных форм бытавання традыцыйнай музычнай культуры беларусаў. Залежнасць інструментальнага акампанементу ад жанравага зместу песні, ад мясцовай традыцыі і формы выканання (спевы адзіночныя і гуртавыя, для людзей і для сябе).

Мужчынская традыцыя спеваў пад дудку. Хатнія спевы «для сябе» пад акампанемент балалайкі, акарыны. Частушкі, бяседныя і лірычныя песні пад гармонік.

### *Тэма 5.3. Сучасныя тэндэнцыі і перспектывысцэнічнага пераасэнсавання беларускай музычнай спадчыны*

Сучасная тэндэнцыя да сцэнічнага ўвасаблення традыцыйнага інструментальнага фальклору. Інструментальныя ансамблі народнай музыкі як характэрная прыкмета часу. Асноўныя тыпы ансамбляў народных інструментаў у залежнасці ад іх творчага кірунку (фальклорныя і акадэмічныя), статусу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(прафесійныя, аматарскія, вучэбныя), адносін да фальклорнай спадчыны (трансляцыя, адаптацыя, аўтарская інтэрпрэтацыя).

Варыянты складаў сцэнічных ансамбляў. Магчымасці мадыфікаваных народных інструментаў у параўнанні з інструментамі аўтэнтычнымі.Трактоўка музыкантамі інструментаў і асаблівасці выканальніцкай манеры.

Рэпертуар сцэнічных фальклорных калектываў. Пераважныя функцыі інструментаў. Прынцыпы пабудовы ансамблевай партытуры. Адрозненне яе ад партытуры аўтэнтычнага ансамбля.

Аўтарскія апрацоўкі народнай музыкі для інструментаў сола і для сцэнічных фальклорных калектываў. Аналіз найбольш папулярных зборнікаў (У. Грома, М. Козенкі, В. Купрыяненкі, У. Савіцкага, А. Стральчонка, М. Слізкага і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТАВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| №№ п/п | Раздзелы і тэмы | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практ. | КСР | Форма кантролю ведаў |
| **1.** | ***Раздзел 1.Тэарэтычныя асновы этнаінструментазнаўства*** | **4** | | | |
| 1.1 | Этнаінструментазнаўства як навука. Структура народна-інструментальнай музычнай культуры вуснай традыцыі | 2 | | | |
| 1.2 | Музычны інструмент як асноўны аб’ект этнаінструментазнаўства. Класіфікацыя музычных інструментаў | 2 | | | |
| 1.3 | Жанравы складі асаблівасці функцыянавання беларускай народнай інструментальнай музыкі. Музыканты і музычныя майстры – носьбіты традыцый народнай інструментальнай музычнай культуры | | | | |
| **2.** | ***Раздзел 2. Беларускія народныя музычныя інструменты класа аэрафонаў*** | **6** | **2** | **2** | |
| 2.1 | Флейтавыя аэрафоны ў традыцыйнай культуры беларусаў. Дудка і акарына | 2 | | | |
| 2.2 | Язычковыя аэрафоны: іх разнавіднасці і сацыяльна-мастацкія функцыі. Беларускае традыцыйнае бурдоннае шматгалоссе ў мастацтве дудароў | 2 | 1 | 2 | практ. заданне |
| 2.3 | Амбушурныя аэрафоны: асаблівасці канструкцыі і функцыянавання. Сігнальныя найгрышы. Свабодныя аэрафоны | 2 | 1 | | |
| **3.** | ***Раздзел 3. Ідыяфоны і мембранафоны ў традыцыйнай музычнай культуры беларусаў*** | **4** | | **2** | |
| 3.1 | Бубен і барабан | 2 | | | |
| 3.2 | Ідыяфоны. Іх агульныя і адметныя | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | рысы | | | | |
| 3.3 | Гармоніку традыцыйнай культуры беларускага народа. Выканальніцкае мастацтва вясковых гарманістаў | 2 | | 2 | апыт-ванне |
| **4.** | ***Раздзел 4. Інструменты групы хардафонаў*** | **6** | **2** | **2** | |
| 4.1 | Скрыпка і яе папярэднікі ў Беларусі. Выканальніцкае майстэр-ства беларускіх скрыпачоў | 2 | 1 | 2 | практ. заданне |
| 4.2 | Традыцыя лірніцтва ў Беларусі | 1 | | | |
| 4.3 | Цымбалы ў музычнай практыцы беларусаў | 2 | 1 | | |
| 4.4 | Шчыпкова-брынкальныя хардафо-ны беларусаў (мандаліна, балалай-ка, гітара, цытра) | 1 | | | |
| **5.** | ***Раздзел 5. Народная музычная інструментальная культура Беларусі: традыцыі і сучаснасць*** | **4** | **2** | **2** | |
| 5.1 | Традыцыйныя інструментальныя ансамблі беларусаў. Спецыфіка па-будовы народнай ансамблевай пар-тытуры | 2 | | | |
| 5.2 | Жанравыя і стылявыя асаблівасці сольных і ансамблевых найгрышаў | | 2 | 2 | тэст |
| 5.3 | Сучасныя тэндэнцыі і перспектывысцэнічнага пераасэн-савання беларускай музычнай спадчыны | 2 | | | |
| | **Усяго…** | **24** | **6** | **8** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*1.* Беларуская народная інструментальная музыка / фоназапісы, натацыя, рэд. і сістэматызацая найгрышаў, уступ.арт. і навук. камент. І. Дз. Назінай. – Мінск, 1989. –С. 5–41.

*2. Бербераў, У.* Гармонік Шчуроўскага / У. Бербераў //Мастацтва Беларусі. – 1989. – №6. – С.72 –74.

*3. Бербераў, У.* Майстар белых баянаў / У. Бербераў //Мастацтва Беларусі. – 1989. – №12.– С.47–49.

*4. Капилов, А.*Скрипка белорусская / А. Капилов. – Минск, 1982. –С.10–19.

*5. Козенка, М.*Столінскія музыкі / М. Козенка //Мастацтва Беларусі. –1990. – №6. – С.70–74.

*6. Мицуль, Н.*Белорусские цимбалы в контексте мировой музыкальной культуры / Н. Мицуль. – Минск, 2006. –С.7–32.

*7. Назина, И.* Белорусские народные музыкальные инструменты: Самозвучащие, ударные, духовые/ И. Назина ; ред. М. Гринблат.– Минск : Наука и техника, 1979. – 144 с.

*8. Назина, И.* Белорусские народные музыкальные инструменты: Струнные / И. Назина ; ред. М.Гринблат.– Минск : Наука и техника, 1982. – 120 с.

*9. Назіна, І.* Беларускія народныя музычныя інструменты / І. Назіна. – Мінск : Беларусь, 1997.–239 с.

*10. Яконюк, Н.* Народно-инструментальная культура письменнойтрадиции в Беларуси: опыт системного анализа / Н. Яконюк. – Минск, 2001. – С.19–21, 24–35.

*Дадатковая*

*1.* Белорусские народные наигрыши / сост. И. Назина. – М. : Музыка,1986.–126 с.

*2. Благовещенский, И.* К истории белорусской народной инструментальной музыки / И. Благовещенский // Некоторые вопросы музыкального искусства. – Минск, 1965. – С.103–143.

*3. Мациевский, И.* Народный музыкальный инструмент и методология его исследования (к насущным проблемам этноинструментоведения) /И. Мациевский// Актуальные вопросы современной фольклористики ;под ред. В. Гусева, А. Горковенко. –Л., 1980. – С. 143–170.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Назіна, І.*Беларуская народная музычна-інструментальная культура:праграма-канспект для музычных ВНУ / І. Назіна. – Мінск : Беларус. дзярж. акад.музыкі, 2005.– 83 с.

5. *Подойницина, Р.* О взаимообусловленности развития музыкального инструментария и исполнительского стиля (на примере белорусских цимбал) /Р. Подойницина //Праблемы этнамузыкалогіі і гісторыі музыкі ў сучасных даследаваннях :зб.дакл. – Мінск,1996. – С. 44–54.

6. *Скорабагатчанка, А.* Народная інструментальная культура беларускагаПаазер'я / А. Скорабагатчанка. – Мінск : Беларус. навука, 1997.– 471 с.

7. *Скорабагатчанка, А.* Беларускія народныя музычныя інструменты XX стагоддзя / А. Скорабагатчанка. – Мінск : Беларус. навука, 2001.– 398 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метады навучання

Метады навучання абумоўлены прадметам, зместам, мэтай і задачамі курса. Асноўная форма заняткаў – лекцыйная з шырокім выкарыстаннем ілюстрацыйнага фота-, фона- і відэаматэрыялаў. Студэнты выконваюць практычныя заданні,сярод якіх: праслухоўванне гуказапісаў з іх наступным вусным або пісьмовым аналізам; стылявы параўнальны аналіз нотных тэкстаў; прайграванне расшыфровак беларускай народнай інструментальнай музыкі на інструменце; прагляд відэафільмаў з іх наступным абмеркаваннем і г. д. Веды, атрыманыя на лекцыях, замацоўваюцца на семінарскіх занятках. Частка тэм адводзіцца для самастойнай работы. Па жаданні студэнтампрапануецца падрыхтоўка рэфератаў. Так, дзякуючы розным формам работы забяспечваецца сувязь паміж тэарэтычным навучаннем і практычным прафесійным станаўленнем будучага спецыяліста.

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

Кантроль вучэбнай дзейнасці студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Народна-інструментальная музычная культура Беларусі» здзяйсняецца пры дапамозе наступных форм дыягностыкі: вусны і пісьмовы жанрава-стылявы аналіз нотных тэкстаў, аўдыя-і візуальных дакументаў; ігра на музычным інструменце расшыфровак сольных найгрышаў; тэсціраванне,апытанне; экзамен.

## Рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа павучэбнай дысцыпліне «Народна-інструментальная музычная культура Беларусі» ўключае: вывучэнне тэарэтычнага матэрыялу; аналіз этнаграфічных фільмаў і аўдыязапісаў; прайграванне расшыфровак народнай інструментальнай музыкі розных жанраў; параўнальны аналіз узораў народнай інструментальнай музыківуснай і пісьмовай традыцый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**НАРОДНА-ІНСТРУМЕНТАЛЬНАЯ МУЗЫЧНАЯКУЛЬТУРАБЕЛАРУСІ**

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*дляспецыяльнасцей 1-16 01 06 Духавыя інструменты(па напрамках),*
*1-18 01 01-02Народная творчасць(па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці Народная творчасць*
*(інструментальная музыка), спецыялізацый1-18 01 01-02 01*
*Інструментальная музыка народная,*
*1-18 01 01-02 02 Інструментальная музыка духавая*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк2020. Фармат 60x84 1/16.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк.1,21. Ул.-выд. арк.0,72. Тыражэкз. Заказ.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ